УДК 398 (476)

***Ж.С.ЦЕРАХАВА***

# ПЕРААДОЛЕННЕ ЗАСУХІ ПАВОДЛЕ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

З язычніцкіх часоў чалавек усвядоміў дэтэрмінаванасць жыцця космасам, залежнасць ўсяго жывога на зямлі ад сонца, прыроднай стыхіі. Але змірыцца з гэтым селянін не жадаў, таму імкнуўся змагацца з разбуральнымі сіламі: засухай, праліўным дажджом, навальніцай, бурай.

“Засуха робіць людзям шмат шкоды: часам як засушыць та пагарыць усё на полі й на сенажаці, выгарыць уся паша. Няма ні сабе хлеба, ні говяду корму, хоць

ты лажыся да й памірай. Гэто ўжэ было даўно, кажуць, была такая засуха, а потым пачаўся голад. Говядо яшчэ сяк-так грызло ў лесе хмызнік, а людзі елі кару, пырнік, мох да усякае ліхо. Шмат людзей памерло, толькі тыя засталіся, хто лавіў зверыну да якую-небудзь рыбіну. От затым людзі так баяцца засухі" [13, с. 93]. Таму ў старажытнасці ў многіх народаў свету існавалі спецыяльныя рытуалы выклікання дажджу: пахание рэчкі ці дарогі, забойства жаб, вужоў, птушак, іншых жывёл, абыходы, маленні... Так як гэтыя дзеянні былі абумоўлены гаспадарчымі патрэбамі, то і выконваліся яны часцей усюды славянамі "з 20 па 30 мая, з 11 па 20 чэрвеня, з 4 па 6 ліпеня, з 15 па 18 ліпеня" [22, с. 86]. На сённяшні дзень мы знаходзім даволі разнастайны матэрыял аб тым, дзе, хто і як выконваў гэтыя магічныя дзеянні, якія не заўсёды паддаюцца лагічнаму тлумачэнню.

Адзін з найбольш старажытных і распаўсюджаных на Палессі магічных спосабаў выклікання дажджу – *узорванне высахшай рэчкі*. С.Талстая адзначае, што "такая кампактнасць можа сведчыць не столькі пра спрадвечны абмежаваны арэал з'явы, колькі пра лепшую захаванасць яго ў гэтай зоне ў процівагу іншым зонам, дзе гэты рытуал, магчыма, выцеснены хрысціянізаванымі формамі (абыходамі, маленнямі і г.д.)" [17, с. 19]. На Гродзеншчыне "сабраліся старые бабы, укралі плуг на калхозным дварэ. Заняслі яго на рэку бабы самыя. Самыя запрагліся, а другія бабы паганялі пугаю, доўгаю пугаю. Як занялі з Славатыч (назва вёскі) дык аж пад мост зацягнулі (прыблізна адзін кіламетр). Па беразе ідуць кілька бабаў, ідуць і співаюць песні. Цягнулі плуг, пераорвалі рэку упопярок у трох мясцах і співалі царкоўныя песні, якія мы зналі. А тады вылязлі з рэкі, паселі на рове і співалі. А потым ўсе хутка пайшлі па сваіх дамах. Трэцяга дня пайшоў дождж" [19, с. 122]. Дадзены абрад сустракаем у ранніх запісах Я.Коласа.

На Магілёўшчыне, наадварот, не аралі, а толькі *баранавалі "жывую" рэчку*: "Бабы-удовы цягалі, у каторых чалавека нету. Удовы. Як дашча нету, ідуць на рэчку і барану нясуць і цягаюць па рэчкі, па вадзе, услед за цячэннем. Кажуць: — Ой, бабы бараны цягалі на рэчкі – дашчу нету" [17, с. 19]. У гэтым жа рэгіёне ў час засухі баранавалі сухую зямлю або кралі барану, вешалі яе на плот, а потым кідалі ў ваду. Часам аб'язджалі, седзячы вярхом на баране, вакол вёскі, мінуючы могілкі. Барана з'яўляецца пераважна прадметам мужчынскай сферы гаспадарчай дзейнасці. Але рытуальнае баранаванне ў кожным з прыведзеных запісаў ажыццяўлялася жанчынамі, што, магчыма, звязана з матывам забеспячэння ўрадлівасці. "Магіі заклікання дажджу, заснаванай на сімвалізацыі ворыва як падрыхтоўкі глебы да апладнення, – сцвярджае Т.Валодзіна, – падпарадкавана выкарыстанне бараны ў плювіяльных абрадах" [2, с. 62]. Рытуальнае баранаванне хутчэй за ўсё з'яўляецца варыянтам рытуальнага абворвання ў час эпідэміі, стыхійных бедстваў. На Браншчыне, напрыклад, "выбіралі прыгожую дзяўчыну ва ўзросце да 15 гадоў, распраналі яе дагала, абвешвалі яе вянкамі і прымушалі ў такім выглядзе баранаваць ваду" [15, с. 109].

Для Гомельшчыны характэрны іншы варыянт дадзенага абраду – *узорванне дарогі ці вуліцы*. Дадзены абрад мог спалучацца і з іншымі рытуальнымі дзеяннямі (капаннем, баранаваннем зямлі, сяўбой, палівам): "удовы бяруць плуг, аруць вуліцу сабою, тады бяруць мак – насеюць, бяруць барану – валочаць, бяруць рэшата і паліваюць" [17, с. 19].

Сустракаецца на Беларусі і такі варыянт абраду выклікання дажджу – *абворванне вёскі ці поля*, што сімвалізуе сабою, трэба думаць, магічнае замыканне круга. Абворванне паселішчаў, як сведчаць запісы, характэрна было многім славянскім народам. Яно магло быць як папераджальным (прафілактычным), так і ачышчальным (прагнаць засуху, эпідэмію, паморак). Разора, якую аралі сахой, лічылася непарадольнай перашкодай. Таму, як адзначае А.Жураўлёў, папе-

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

раджальнае абворванне ажыццяўлялася ноччу, у абсалютнай цішыні, каб не наклікаць няшчасця. Ачышчальнае ж абворванне адбывалася, наадварот, з шумам, звонам, крыкам, каб напалохаць хваробу ці засуху і прагнаць за межы акрэсленай мясцовасці [6, с. 78]. Нашы прыклады не заўсёды пацвярджаюць дадзенае меркаванне. Часцей за ўсё дождж заклікалі ноччу, у абсалютнай цішыні, без сведкаў. З гэтага можна зрабіць выснову, што ў беларусаў абворванне ў час выклікання дажджу з'яўлялася прафілактычным, каб забеспечыць поспех, яно спалучалася з іншымі магічнымі дзеяннямі.

Часам вёску абходзілі з палатном-абыдзённікам, якому надавалася выратавальная сіла. Лічылася, што ў магічнае кола, утворанае пры гэтым, не можа пранікнуць няшчасце, а значыць і засуха. Палатно для абраду павінны былі выткаць жанчыны гэтай вёскі ад усходу і да заходу сонца – усяго толькі на працягу аднаго дня: "<...> сабіраімса і ўсе садзімса прадум. Дзевяць етых баб, сколька у нас і е, ўсе прадом. Му прадом, падаём от верацёна тые, ручайкі такіе, і ані ужэ снуюць на сьцену, ужэ снуюць, а му прадум. Аснуюць, навьём на нарад, ужэ на перамену – то тая, то тая. Шэ й до вечэра вутком. І ужэ вечэром наварім вечэрі, падгатовім ужэ што там, што ш каторыі е, прінесе і вазьмом у магазіне, вазьмом і падгатовім і ужэ сядом. Пастаном, памолімса богу і пасядом, памолімса богу, павечэраем, разойдомса і той ужэ рушнік, такі от як с аднаго кутка і от да етаго кутка, такі во то рушнік на ўсю хату, аснуём на калочкі і ужэ снімом яго і накруцім на такую навуйку. І ужэ сядум, ужэ то тая, то тая – то і за дзень і вутком. Ужэ коб за дзень зрабіць, пака сонцэ не зайдзе. Ужэ му і вутком, ужэ бо му стараемса, вутком. <...> Так от хадзілі да пелі да селі вечар вечэраць, а хмарка ні ссюль ні стуль найшла і дождж прайшоў" [4, с. 130]. Устрыманне ад ежы ўвогуле садзейнічае поспеху ў працы. Дадзены запіс сведчыць, што дождж клікалі нашча, бо , звяртаючыся да Бога, спадзяваліся на поспех.

Ва Украіне і ў Расіі сустракаецца яшчэ адзін варыянт абраду выклікання дажджу – *узорванне зямлі каля крыніцы або балота.* С.Максімаў сцвярджае, што ў Разанскай губерні дзяўчаты і ўдовы, якія жывуць без мужа болей за 10 гадоў, у белых кашулях, таемна ад усіх, хадзілі да бліжэйшай крыніцы, чысцілі яе і маліліся Богу, каб пайшоў дождж. А ва Уладзімірскай губерні "ўдовы ноччу ідуць у поле, там чытаюць акафіст, потым аруць балота, а старыя жанчыны рассцілаюць на агародах кашулі, і калі на іх сядзе раса, то гэта лічылася добрай прыкметай: будзе дождж" [11, с. 441]. У Сімбірскай губерні, як адзначае А.Карынфскі, яшчэ нядаўна "багамольныя бабулькі-манашкі ішлі засушлівай вясной да святара і прасілі благаславіць "ісці на грымучы". Затым яны падыходзілі да крыніцы і непадалёк ад яе пачыналі капаць зямлю. Калі ім удавалася дакапацца да новай вадзяной "жылы", гэта лічылася знакам таго, што Бог злітаваўся над хлебаробам, і ў хуткім часе пойдзе дождж. Яны вярталіся дадому з малымі, якія гучна спявалі: "Дождик, дождик, пуще!/ Дам тебе я гущи!/ Уж ты дождь – дождем/ Поливай ведром/ На девкину рожь,/ На бабину пшеницу" [8, с. 70-71].

Магічныя дзеянні ў кожным з прыведзеных прыкладаў для забеспячэння поспеху выконваліся пераважна старымі жанчынамі. А.Максімаў яшчэ ў пачатку XX ст. сцвярджаў, што абрад выклікання дажджу – спецыфічна жаночы абрад. Але, як адзначае С.Талстая, "сустракаюцца выпадкі, калі абрад выконвалі жанчыны наогул або нават старыя мужчыны ці нават хлопчыкі" [17, с. 20].

Колькасць удзельнікаў абраду таксама не была выпадковай – тры, сем, а часцей дзевяць чалавек. Гэтыя лічбы (3, 7, 9) з'яўляюцца магічнымі, свяшчэннымі ў многіх народаў свету. Асабліва звяртае на сябе ўвагу лік дзевяць. Папершае, гэта тройчы тры. Па-другое, нагадвае пра дзевяцімесячнае жыццё дзіцяці ў целе маці і яго нараджэнне. Значыць, гэта колькасць удзельнікаў павінна была

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

забяспечыць найлепшы вынік (выклікаць дождж, садзейнічаць росту і жыццю раслін).

Аб старажытнасці абраду сведчыць яго шырокая распаўсюджанасць у іншых народаў свету, прычым у многіх супадаюць нават дэталі (узорванне плугам ці бараной, якія выкрадалі, бо выкрадзеныя прадметы лічыліся найбольш дзейснымі, выконвалі абрад пераважна старыя жанчыны, часам голыя, дзеянні выконваліся часцей ноччу з трохразовым паўторам: аруць на сабе, аруць кругавымі рухамі па сонцу). У пшаваў і хеўсураў на Каўказе існуе рытуал "узорванне дажджу": "Дзяўчаты ўпрагаюцца ў плуг і цягнуць яго ў рэчку да таго часу, пакуль вада не дойдзе ім да пояса" [20, с. 85]. "У Індыі жанчыны, распранутыя дагала, ноччу цягнуць плуг па полі, у той час мужчыны імкнуцца трымацца ад гэтай працэсіі надалей, каб не пашкодзіць" [20, с. 85]. "У Трансільваніі, калі глеба трэскаецца ад засухі, некалькі дзяўчын распранаюцца дагала і пад кіраўніцтвам жанчыны старэйшага ўзросту, таксама голай, крадуць барану і цягнуць яе праз усё поле да ручая" [20, с. 85]. Галізна ў кожным выпадку пацвярджала сакральнасць акта. Рытуальнае распрананне сімвалізуе цэласнасць і паўнату, адкрытасць для кантакту з іншым светам, вяртае чалавека да першароднай чысціні і бязгрэшнасці. Катэгорыя "голае" выводзіць чалавека па-за межы культуры, далучае да катэгорый "чужога" і "неасвоенага". Таму, распранаючыся, селянін быццам бы станавіўся прадстаўніком іншасвету ці роду і яго магічныя дзеянні забяспечвалі поспех. З цягам часу заўважаецца адыход ад патрабавання поўнай галізны ўдзельнікаў абраду, яна змяняецца на частковае распрананне (здымалі хустку, сукенку, верхнюю вопратку).

У зборніку А.Сержпутоўскага знаходзім даволі своеасаблівае сведчанне аб выкліканні дажджу: "вечарам, после заходу сонца дзеўкі й маладзіцы збіраюцца да купы, гамоняць, крычаць, а потым ідуць у поле, бегаюць там з крыкам да ўсе разам сцуць, а потым варочаюцца дамоў, пакрыўшыса хвартухамі, нібыта йдзе дож. Кажуць, што тагды не хібіць пайсці вялікі дож." [13, с. 93]. Так як выбіраліся толькі дзяўчаты, то можна дапусціць, што яны павінны былі ўвасабляць сабою дачок Перуна, бога, які стаяў над імі. У Балгарыі, Сербіі гэтых дзяўчат называлі пеперунамі, пеперудамі, пеперугамі і г.д.

Ва ўсходніх славян даволі распаўсюджана меркаванне аб тым, што зямная вада звязана з нябеснай. Таму каля калодзежаў, крыніц, азёр часта выконваліся разнастайныя магічныя дзеянні, каб "адкрыць" неба. Прадметам, які нагадваў старажытнаму чалавеку неба, з'яўлялася рэшата, бо праз яго "прасейваліся" як дождж, так і сонечныя прамяні. Таму ў час засухі "ходыла процэсія і рэшэтом воду носілы в девяць колодцев", бо праліітая праз рэшата вада лічылася магічнай, здольнай выклікаць дождж. Нельга не пагадзіцца з Т.Валодзінай, якая лічыць, што "магічная адзначанасць сіта ў рытуалах выклікання дажджу звязвалася з паўтарэннем праз гэтае дзеянне касмаганічнага акту стварэння свету. Праз судачыненне з небам, дажджом, сонцам як сімваламі актыўнага мужчынскага пачатку рэшата набывае функцыі прадмета-замяшчальніка хлопца-мужчыны" [2, с. 32]. Таксама, калі хочуць, каб пайшоў дождж, "та ў калодзесь сыплюць свянцоны мак" [13, с. 44], "нясуць на поле воду з сямі калодзісяў і разліваюць яе па пашні" [13, с. 44], у Гомельскай вобласці "чэсная ўдава павінна ісьці на поле, дзе пасецца скот, раздзецца. Яна бере ваду з сабой і на тым полі яна павінна памыцца. Гэта вызывала дождж. Яшчэ ўдава сыпіць у тры калоццы мак самасейку, свецяць і сыпяць у калодзец воду пасвяцонную" [4, с. 131], "бяруць з трох калодзісяў вядро вады, моўчкі нясуць яе на поле й там разліваюць па сухой зямлі. Потым, памаліўшыся Богу, такжэ моўчкі варочаюцца дамоў. Кажуць, што гэто вельмі добрэ памагае" [13, с. 93]. Але часцей усё ж такі цішыню не захоўвалі, а

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

рабілі як мага болей шуму: палілі вогнішча, барабанілі ў заслонкі, скакалі, абліваліся вадою (сімільная магія), смяяліся. М.Шахновіч сцвярджае, што "ў старажытнасці, калі хацелі выклікаць дождж, адзін селянін стукаў малатком па пустой бочачцы, імітуючы гром, другі – цёр адну аб другую дзве галавешкі, раскідваючы іскры, што павінна было ўяўляць сабой маланку, трэці апускаў пучок галін у пасудзіну з вадой і пырскаў зямлю" [21, с. 131]. Старажытныя продкі прыпісвалі смеху магічную сілу. Яны верылі: чым больш будзе смеху, тым багацейшым будзе ўраджай. У.Проп мяркуе, што "сіла смеху павінна была забяспечыць зямлі жыццядзейную сілу, дапамагчы ёй у яе народзінах" [12, с. 102].

У калодзеж акрамя маку, які сімвалізаваў кроплі дажджу, маглі кідаць семя лёну, збожжа (часта выкарыстоўвалася ў розных усходнеславянскіх абрадах, бо апошняе шляхам кантактнай магіі забяспечвала ўраджай, багацце, дабрабыт удзельнікаў абраду), асвячоныя зёлкі, кветкі, просвіру (сэнс апошняй цяжка растлумачыць), крыж, асвячоную ваду, снег. Засуха знішчала ваду ў вадаёмах, таму яшчэ зімой селянін клапаціўся пра тое, каб захаваць ваду ў калодзежах. З гэтай мэтай у іх кідалі снег, які збіралі на Каляды: "вяскоўцы былі ўпэўнены, што такі снег можа захаваць у калодзежах ваду на працягу года. Неабходна толькі з поля прынесці снегу, апусціць яго ў калодзеж, і тады ад яго будзе падмога на ўвесь год, нават калі за ўсё лета не было ніводнай кроплі дажджу" [14, с. 231].

Часам каля вадаёмаў скакалі са змеямі, вужамі. Відавочна, апошнія ўяўляліся тут пасрэднікамі паміж зямлёй і небам. Жывуць яны ў вільготных месцах, недалёка ад вады, а ў час дажджу наогул выпаўзаюць са схованак. Таму земляробы звязвалі іх з'яўленне з дажджом. З гэтай нагоды А.Голан адзначае: "Гэта не адзіны факт, які даў падставу так меркаваць. Рэчка або ручай цячэ, выгінаецца, як змяя, гэта і магло паслужыць прычынай асацыятыўнай сувязі "змяя – вада". Так як змяя выпаўзае з земляной нары, крыніца выцякае з-пад зямлі і затым бруіцца выгінаючыся" [3, с. 77]. Змей з'яўляецца прамым водгуллем медыятыўнай сувязі паміж зямлёй і падземным светам у беларускім фальклоры. "Вобраз змея развівае тэму нараджэння і смерці, пачатую архетыпам воднага хаосу, што хавае ў сабе ідэю ўрадлівасці. Таму змей часта звязваецца не толькі з падзем'ем, але і з сусветным Акіянам, увогуле воднай сферай. Між тым неаформленая стыхія вады блізкая да паняцця разбурэння, таму змей, што яе ўвасабляе, заўсёды ўяўляецца жахлівай пачварай" [9, с. 104]. Многія плямёны лічылі, што змеі выпіваюць усю ваду, таму наступае засуха. Прыкмета "забіць змяю – да дажджу" тлумачыць, чаму ажыццяўляліся магічныя дзеянні з нежывымі змеямі.

Да хтанічных істот беларусы адносілі таксама жабу, рака, яшчарку, вош, мядзведку, мураша, якіх часцей за ўсё знішчалі ў час засухі, каб выклікаць дождж. Таксама з гэтай нагоды на Палессі палкай разбуралі мурашнік. Розных жывёл маглі забіваць палкай, камянём, разрываць на часткі, а потым падвешвалі на галінах дрэў, над калодзежам, часам выкідвалі на дарогу ці скрыжаванне або нават хавалі, як нябожчыка.

Існавала павер'е, што жаба закрывае сабою крыніцы, таму наступае засуха. Здаўна даволі распаўсюджана было меркаванне, што забойства гэтай істоты здольна выклікаць дождж. Павер'е дажыло да нашага часу: калі забіць жабу, то пойдзе дождж або калі нават жаба сядзіць на траве (у траву выпаўзае) – да дажджу [УЗ]. На Палессі ў час засухі ў лапці перавозілі забітую жабу да месца яе пахавання і рытуальнага галашэння па ёй [4, с. 96]. Лапаць у дадзеным выпадку выконвае функцыю труны і забяспечвае аб'яднанне з зямлёй, слёзы магічна прыпадабняюцца да дажджу. У Хойніцкім раёне "бралі пачак запалак, жабу ўбіралі (апраналі ў вопратку) і галасілі як па нябожчыку, потым закопвалі жабу каля крыніцы, на зямлі рукой малявалі крыж" [16, с. 23]. У слоўніку У.Дабравольскага

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

знаходзім наступныя радкі: “Калі не было дажджу, дарослыя імкнуліся выклікаць яго некаторымі дзеяннямі: забівалі жаб, нанізвалі іх дзе-небудзь на дрэве, прыгаворваючы: “як гэтыя жабы, цвыркуны, блыхі павіслі, каб так над намі і хмары навіслі” [5, с.172]. У Лельчыцкім раёне, калі павесяць вош, галасілі: “Ох, божэ ж мой, да калі я цябе прыжду – прыжду. Мабуць, ніколі ўжэ не прыйдзеш”. Зловяць вош і прывяжуць на касабочыну, прывяжуць і ля калодзежа павесяць” [16, с. 24]. Усходнія славяне даўно заўважылі, што ракі перад ліўневым дажджом закапваюцца ў пясок. На аснове гэтага назірання, відаць, і ўзнікла міфалагічная прыкмета: “калі ў час засухі закапаць жывога рака ў зямлю, то пойдзе дождж”.

Як бачым, дзеянні, якія ажыццяўляліся з рознымі хтанічнымі істотамі, звязаны з архаічнымі ўяўленнямі старажытнага чалавека пра смерць і “той свет”. Мясцовыя ж адрозненні ў выкліканні дажджу не кранал самой сутнасці абраду (дзеянні адбываліся з хтанічнымі істотамі, якіх знішчалі (вешалі ці забівалі), а потым маліліся каля вады. Падобныя спосабы выклікання дажджу знаходзім на Украіне, у паўднёвых славян, у Індыі, Абхазіі. Згодна з вераваннямі індзейцаў Паўночнай Амерыкі ў іх ёсць “гаспадары дажджу”. Гэта жывёлы, якія крычаць перад дажджом. Таму, каб выклікаць дождж, “індзейцы квакалі, як жабы, скакалі, імітуючы іх рухі, садзілі жабу пад перакулены гаршчок і стукалі па дне кіямі, бо спадзяваліся, што, спалохаўшыся, яна заквакае і “зробіць дождж” [21, с. 134].

Даволі распаўсюджаным на Беларусі быў такі абрад выклікання дажджу, як абліванне вадой (заклінальная мэта). Рытуальна-магічныя дзеянні ў час засухі выконвалі многія еўрапейскія народы. У Маларыцкім раёне “у сухую сэрэду хлопцы дівчат обліваютъ вадой, іграюцца; по обліваюцца, по селові бігают” [18, с. 280]. Вяскоўцы ў раёне Ваўкавыска гаварылі, калі доўга не было дажджу: “трэба бабоў на рэку гнаць, плавіць” [15, с. 108]. Маглі абліваць таксама вуглы хат, пастухоў (бо воблакі ўяўляліся статкам, таму меркавалі, што зямны пастух можа ўздзейнічаць і на нябесны статак), цяжарную жанчыну ці кормячую маці. Даволі ж эфектыўным, як лічылі сяляне, будзе вынік ад абраду, калі ўдавалася абліць царкоўнага чалавека, і ў першую чаргу – бацюшку, бо ён сімвалізаваў пастуха – пастыра. “Калі не было дажджу, жанчыны хаваліся ў копані невялікай сажалкі і імкнуліся ўцягнуць у ваду мужчын, якія праходзілі побач, асабліва ж яны былі задаволеныя, калі траплялася асоба духоўніка, напрыклад, дзячок” [5, с. 173]. Пры гэтым імкнуліся абліваць святара абавязкова з галавы, бо лічылася, што тады хутчэй перастануць дзейнічаць чары вядзьмарак, якія ўтрымліваюць дождж, насылаюць град і буру. М.Шахновіч сцвярджае, што ў Пензенскай губерні яшчэ ў XIX ст. “абліванне вадой святара ў рызе лічылася лепшым спосабам выклікання дажджу” [21, с. 132]. На Беларусі ж часцей святара не аблівалі, а “як толькі доўга няма дажджу, та гадзяць да завуць на поле папоў з абразамі, каб яны вымалілі ў Бога дож” [13, с. 93]. “Бало, як суша, то кажнэ просыло бога: “Дай божэ дошч”, “коб господь дожчык послав, бо всэ повасыхало”. Бало, старыйі скажуць: “Всі просітэ бога, всі: і вытэ, старыйі, просытэ, і вытэ, молодыйі, і вытэ, діткі, шоб дав быг дошчык”. Помытаю, як була суша, як ны було воды коровам пыты, то копалы ямы в струзы. Струга й так нізка, то коб було лыбей, то в стузы копалы...” [4, с. 132].

Фальклорна-этнаграфічныя запісы сведчаць, што нават да сярэдзіны XX стагоддзя захоўваліся хрысціянізаваныя маленні, абыходы вёскі ў час засухі: “О, у Лысынцях, то шэ ныдавно, як ны было дошчу, то бабы с процэсыйію ходылы, дэсь в 1956 – 1960 роках. Да походылы тыйі бабы с процэсыйію, да й пошов дошч. Да сталы людэ говорыты: “Чаму тыйі лосынські бабы ранёй с прцэсыйію ны пошлы, можэ, впыріжд дошч пошов бы” [4, с.132]. Аб тым, як адбываўся гэты абыход вёскі, сведчыць наступны запіс: “Ек ны було дошчу, то ходэлэ с процэсыйію <...> Нікотора баба взяла ікону, Матер божа була, ручныком тако звэрху

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

<...> Зобралыся, пошлэ до цэрквы с тэю іконыю, пуд двэры. Пуд цэрквыю помолылыся, тыйі молітвы, шо завшэ, і попросэлэ бога дошчу – суш выліка була. <...> Моглыц ны обходылэ, а пушлэ на сыло. После обыйшлы всё сыло вкруговую, по-за хатамэ, оно тых хат, шо хутырі пуд Высходамы, то ны зайнялы. Од цэрквы йшлэ на зыход [г. зн. на ўсход – Ц.Ж.]. Поплавамэ йшлэ, пуд Сэмоновськэ, пуд Былэнськэ. А йшлэ, то спывалэ, все врэмне спывалэ, тыйі пісні, шо в цэрквы спывають. “Отчэ наш” спывалэ, “Господі помілуй”, ну, й такыйі пысні” [4, с. 131].

У вёсцы Крамянец Лагойскага раёна знаходзіцца валун (вяскоўцы называлі яго Богаў камень, Святы, Дажбогаў), які “прыносіць” дождж: “Той, хто прыходзіў да каменя, спачатку клаў ахвяру (“ахвяраваўся”) <...> Неслі грошы, хлеб, хусцінкі, тканіну, яблыкі, пернікі, ягады, кветкі, хто што мог <...> Асабліва выручаў камень у засуху. Калі доўга стаяла суша, а на агародах усё марнела, хто-небудзь са старэнькіх бабуль ішоў па хатах і збіраў дзевяць удоў (зноў магічная лічба – Ц.Ж.) Жанчыны загадзя нарыхтоўвалі драўляныя калкі ў рост чалавека. Калы падсоўвалі пад камень і прыўзнімалі яго, падважвалі. Пасля гэтага на трэці дзень чакалі дажджу. Калкі заставаліся пад каменем столькі часу, колькі трэба было, каб ішоў дождж. Калі дождж быў больш не патрэбны, іх забіралі” [10, с. 66]. Дадзены запіс сведчыць аб язычніцтве беларусаў, часе, калі абагаўлялася прырода. Ён з'яўляецца яскравым сведчаннем таго, што рэшткі паганства, нягледзячы на ўціск хрысціянства, дажылі і да нашага часу.

Здаралася, што ў час невыноснай засухі пасля царкоўнай службы прыхаджане маглі зваліць на зямлю святара ў рызе і абліваць яго вадой. Аблівалі або нават кідалі ў ваду вядзьмарак, бо лічылася, што вядзьмарка не тоне ў вадзе. У час засухі сяляне мелі патрэбу ў вядзьмарках, таму і ішлі да іх, у той жа час іх лічылі пасрэднікамі паміж “тым” і гэтым светам, а таму баяліся і знішчалі. На Украіне яшчэ ў 20-х гг. XX ст. успаміналі пра тое, як “стараста сабраў усіх жанчын і загнаў іх у рэчку прама ў вопратцы, бо лічыў, што сярод іх магла быць вядзьмарка, якая ўтрымлівае дождж” [18, с. 108].

Даволі часта сустракаем на Беларусі сведчанні пра тое, што абліваліся вадой і магілы самагубцаў. Ненатуральную смерць славяне ўспрымалі як пагрозу для ўсіх стыхійнымі бедствамі. Таму тапельцаў, шыбенікаў, п'яніц не хавалі на агульных могілках, бо гэта атаясамлівалася са знявагай да культу продкаў-заступнікаў. Месцамі іх пахавання з'яўлялася мяжа, скрыжаванне дарог, роў, лес, балоцістае месца ці нават вада (кідалі ў ваду). “Прычынай засухі магло быць пахаванне на могілках чалавека, які памёр не сваёй смерцю, асабліва шыбеніка” [19, с. 107]. З цягам часу самагубцаў усё ж такі пачалі хаваць пад крыжамі на ўскрайку могілак, але ў засуху вырывалі крыж з магілы шыбеніка і лілі туды ваду, каб замачыць нябожчыка, бо менавіта яго пахаванне з крыжом лічылася прычынай засухі.

На востраве Ява, як адзначае Д.Фрэйзер, калі неабходна было выклікаць дождж, двое мужчын пачыналі гнуткімі прутамі біць адзін аднаго да таго часу, пакуль з іх спін не пачынала ісці кроў, якая сімвалізавала дождж. Людзі былі ўпэўнены, што пасля гэтага абавязкова пойдзе дождж. У беларусаў таксама існавала павер'е: чым болей крыві, тым лепшы дождж. Для гэтага рэзалі барана, якога ахвяравалі богу дажджу.

Існавалі дні, калі нават забаранялася выконваць пэўныя сельскагаспадарчы працы, бо гэта пагражала засухай. На Палессі такія дні называлі “сухімі”. Але нават у гэтым рэгіёне не было дакладнага вызначэння такога дня. Часцей (на большай частцы Палесся) ім лічыўся чацвер на Сёмушным тыдні, часам (усход Брэсцкай вобласці) святкавалі чацвер на Велікодным тыдні, на заходніх ускраінах Палесся гэта была серада пасля Вялікадня ці чацвёртая пасля Вялікадня (пераплаўная). Гэтыя перасцярогі былі звязаны з працамі на зямлі (забаранялася

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

капаць, сеяць, палоць, баранаваць). Але, напрыклад, у Пінскім раёне была агаворка ў адносінах да раслін, што не цвітуць: "Сухый чэтвэр. После Паскі і после Троіцы мы нэ полэм, нэ робым ныц цвітючэго: вот картошка, напрымер, цвітэ, огурцы, мы йіх нэ полэм. А шчо нэ цвітэ, то можно" [1, с. 89]. З-за боязні "загарадзіць" дождж не гарадзілі агароджу ў "сухія" дні (Маларыцкі, Кобрынскі, Ляхавіцкі і інш. р-ны). Часцей гэта датычылася Благавешчання. Да гэтага свята беларус адносіўся з вялікай пашанай, бо яно з'яўлялася мяжой паміж зімой і летам. Лічылася, што ў гэты дзень "абуджаецца" зямля, прырода, што гэта свята прылёту бусла ("Хоць снегам падаўлюся, а к Благавешчанню вярнуся"). Таму сяляне ўважліва сачылі за надвор'ем у гэты дзень. Існавала шмат феналагічных прыкмет: "мокрым выдавалася Дабравешчанне – грыбное чакаецца лета", "дождж на Благавешчанне – прадвеснік важкага аржанога караваю, сухмень – на засуху", "на Благавешчанне або на Вялікдзень падае дождж – засухі летам не будзе". Добрым знакам быў дождж, які пайшоў у гэты дзень. Тым не меней, гэтыя назіранні не з'яўляліся асноўным сведчаннем добрага ці дрэннага ўраджаю або надвор'я. Была яшчэ цэлая сістэма забаронаў, бо гэты дзень, паводле павер'яў, лічыўся небяспечным, здольным парадзіць засуху, летнія замаразкі ці холад, а, значыцца, адмоўна паўплываць на чалавека, яго гаспадарку: да Благавешчання забаранялася есці на вуліцы, хадзіць босымі па зямлі, адчыняць вокны, выганяць жывёлу на вуліцу, перасушваць на двары вопратку, спяваць.

Абрады выклікання дажджу ў беларусаў даволі разнастайныя, але ў аснове кожнага з іх ляжаць магічныя дзеянні, якія выконваліся каля вады або з выкарыстаннем вады, хтанічных істот ці прадметаў, што сімвалізуюць кроплі дажджу. Шматлікія абрадавыя дзеянні ў час засухі цесна пераплятаюцца з дзеяннямі іншых абрадаў (абарона ад хваробы, забеспячэнне ўрадлівасці), якія С.Талстая называв "міжабрадавымі" элементамі: "біццё" (выклікае ўрадлівасць), галізна (сцвярджае сакральнасць акта), абход (устанаўлівае сакральнасць месца выканання рытуала і тым самым яго абароненасць ад нячыстай сілы і г.д.), не гаворачы ўжо пра паўсядзённыя дзеянні (тканне рушніка, выраб крыжа), аб ахвяраваннях, аб стварэнні і "ўмярцвенні" лялькі, вядомай і ў сувязі з іншымі святамі (Купала, Каляды і г.д.)" [9, с. 126].

Абрады выклікання дажджу адышлі ў нябыт, і толькі час ад часу сёння іх адгалоскі гучаць у дзіцячых заклічках аб кармленні дажджу ці ў малазразумелых для сучаснага чалавека выказваннях. Выключна ў час засухі старымі людзьмі ўзгадваюцца прычыны, якія маглі яе выклікаць, і тое, як яе перапыніць. У цэлым на мяжы XIX – XX стст. назіралася даволі стракатая карціна выклікання дажджу – адначасова з хрысціянізаванымі формамі абраду працягвалі бытаваць і больш архаічныя. Некаторыя з іх пераасэнсоўваліся, некаторыя забываліся, сэнс пэўных – цяжка растлумачыць.

## ЛІТАРАТУРА

1. ***Агапкина Т.А.*** Очерки весенней обрядности Полесья // Славянский и балканский фольклор / Этнолингвистическое изучение Полесья. – М., 1995. – С. 24-107.
2. ***Валодзіна Т.В.*** Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў. – Мн., 1999.
3. ***Голан А.*** Миф и символ. – М.,1994.
4. ***Гура А.В., Терновская О.А., Толстая С.М.*** Материалы к полесскому этнолингвистическому атласу // Полесский этнолингвистический сборник. Материалы и исследования. – М., 1983. – С. 49-153.
5. ***Добровольский В.*** Смоленский областной словарь. – Смоленск, 1914.
6. ***Журавлев А.Ф.*** Охранительные обряды, связанные с падежом скота, и их географическое распространение // Славянский и балканский фольклор / Генезис. Архаика. Традиции. – М., 1978. – С. 71-94.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

7. ***Коваль У.І.*** Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі. – Гомель, 1995.
8. ***Коринфский А.*** Круглый год сказаний, поверий, обычаев и пословиц русского народа. – Смоленск, 1995.
9. ***Кудрашова Т.*** Міфалагема змяі як культуралагічная праблема // Роднае слова. – 2001. – №1. – С.102-105.
10. ***Ляўкоў Э.А.*** Маўклівыя сведкі мінуўшчыны. – Мн., 1992.
11. ***Максимов С.В.*** Куль хлеба. Нечистая, неведомая и крестная сила. – Смоленск, 1995.
12. ***Пропп В.*** Русские аграрные праздники. – Л., 1963.
13. ***Сержпутоўскі А.К.*** Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мн., 1998.
14. Сказания русского народа, собранные И.П.Сахаровым: Сборник. – М., 1990.
15. ***Толстая С.М.*** Дождь // Славянские древности: Этнолингвистический словарь: В 5 т. – М., 1999. – Т.2. – С.106-111.
16. ***Толстая С.М.*** Лягушка, уж и другие животные в обрядах вызывания и установки дождя // Славянский и балканский фольклор: Генезис, архаика и традиции. – М, 1986. – С.22-27.
17. ***Толстая С.М.*** Пахание реки, дороги // Славянский и балканский фольклор: Генезис, архаика и традиции. – М, 1986. – С.18-22.
18. ***Толстая С.М.*** Полесский народный календарь. Материалы и исследования // Славянский и балканский фольклор / Этнолингвистическое изучение Полесья. – М., 1995. – С. 257-317.
19. ***Толстой Н.И., Толстая С.М.*** Заметки по славянскому язычеству. 2. Вызывание дождя в Полесье // Славянский и балканский фольклор: Генезис, архаика и традиции. – М, 1978. – С.95-130.
20. ***Фрейзер Д.*** Золотая ветвь. – М.,1980.
21. ***Шахнович М.И.*** Приметы верные и суеверные. – Л., 1984.
22. ***Шуклин Ю.*** Мифы русского народа. – Екатеринбург, 1995.

## SUMMARY

*Our patriarchal ancestors' attempts to influence nature are the subject matter of the article. The analysis of the rites asking for rain are rather diverse. But the majority of them are based on the magic actions to be performed near water or with water or any other objects that symbolize it.*

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова